**Д. А. Доўгаль,**
старшы выкладчык Магілёўскага
дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Куляшова

# ВЫНІКОВЫ ТЭСТ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## (XII клас, паглыблены ўзровень)

### ЧАСТКА А

**Падкрэсліце правільны адказ — «так» або «не».**

| | | |
|---|---|---|
| **A1** | «Адвечная песня» Янкі Купалы — гэта драматычная паэма | так/не |
| **A2** | «Мой бацька, дзед, прадзед, прапрадзед, прапрапра... і г. д. — усе былі мужыкамі» — гэтыя словы належаць Самсону Самасую | так/не |
| **A3** | Пімен Панчанка — прадстаўнік заходнебеларускай літаратуры | так/не |
| **A4** | Аповесць «Знак бяды» — твор літаратуры сімвалізму | так/не |
| **A5** | «Суцэльны ланцуг супастаўленняў і пераходаў "вялікага" часу космасу і прыроды. А побач — вобразы "прыватнага" чалавечага часу з яго імкненнем спыніць няўлоўны момант і міг...» — гэта выказванне Р. Бярозкіна характарызуе творчасць А. Куляшова | так/не |
| **A6** | Тэорыя бесканфліктнасці — адзнака літаратуры сацыялістычнага рэалізму | так/не |
| **A7** | Уладзімір Караткевіч з'яўляецца лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі | так/не |
| **A8** | П'еса Кандрата Крапівы «Брама неўміручасці» — мастацкі маніфест тэатра абсурду | так/не |
| **A9** | Максім Танк — майстар беларускага верлібра | так/не |
| **A10** | Якуб Колас і Паўло Тычына займаліся ўзаемаперакладам | так/не |

### ЧАСТКА Б

**Выберыце і падкрэсліце адзін з чатырох прапанаваных варыянтаў адказу.**

**Б1.** Якое з літаратурных аб'яднанняў не існавала ў 20-ыя гады XX стагоддзя?

«Маладняк», «Тутэйшыя», «Узвышша», «Полымя».

**Б2.** Хто з наступных паэтаў ураджэнец Магілёўшчыны?

Максім Танк, Пімен Панчанка, Аркадзь Куляшоў, Пятрусь Броўка.

**Б3.** Верш М. Багдановіча «Жывеш не вечна, чалавек...» уваходзіць у наступны цыкл зборніка «Вянок»:

«Старая Беларусь», «Думы», «Згукі Бацькаўшчыны», «Места».

**Б4.** Які з твораў прэзентуе еўрапейскую літаратуру «згубленага пакалення»?

Ф. Кафка. «Ператварэнне»; М. Гарэцкі. «На імперыялістычнай вайне»; Э. Хемінгуэй. «Стары і мора»; А. дэ Сент-Экзюперы. «Планета людзей».

**Б5.** Паняцце «раман-народ» А. Адамовіч выкарыстаў, характарызуючы:

раман К. Чорнага «Пошукі будучыні», «Палескую хроніку» І. Мележа, трылогію Я. Коласа «На ростанях», раман М. Зарэцкага «Вязьмо».

**Б6.** На карце літаратурнай тапанімікі беларускага прыгожага пісьменства адсутнічае:

вёска Ніжнія Байдуны, мястэчка Шапятоўка, вёска Цельшына, вёска Стары Улас.

**Б7.** Які з названых твораў нашай літаратуры не быў экранізаваны?

«Знак бяды», «Каласы пад сярпом тваім», «Людзі на балоце», «Раскіданае гняздо».

**Б8.** Якая з названых аповесцей не ўваходзіць у пенталогію І. Шамякіна «Трывожнае шчасце»?

«Непаўторная вясна», «Пошукі сустрэчы», «Завеі, снежань», «Агонь і снег».

**Б9.** У якой з прыведзеных пар нісьменнікаў супадаюць гады і нараджэння, і смерці?

Быкаў — Сартр, Мележ — Мілаш, Караткевіч — Чапек, Чорны — Сент-Экзюперы.

**Б10.** «Край беларускі — лясісты і балоцісты. Вось нам і трэба стварыць паэзію лесу, паэзію дрыгвы. Украінская стыхія — стэп, у нас наша стыхія — лес і балота. Тут ёсць свая адменная краса, адменная рытміка, адменны чар. Трэба іх падгледзець, знайсці і вынесці на шырокі свет...»

Гэта перакананне Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Язэпа Пушчы, Івана Мележа.

### ЧАСТКА В

**Запішыце на месцы пропуску правільны адказ.**

**В1.** «Уласна кажучы, мне трэба было б так і застацца кавалерам. Так было б сумленна. Таму што я любіў у жыцці толькі адну жанчыну, Беларусь» — дзённікавы запіс (чый?) ______________________.

**В2.** У. Жылка, Б. Мікуліч, М. Стральцоў, Я. Міклашэўскі прысвяцілі гэтаму чалавеку свае творы ________________.

**В3.** Расстаўце творы В. Быкава ў парадку іх нанісання:

___ «Знак бяды»; ___ «Сцяна»; ___ «Жураўліны крык»; ___ «Сотнікаў».

**В4.** Хто з беларускіх пісьменнікаў так гаварыў пра сябе і сваю творчасць: «А ты, бывае, сумна ці раздражнёна думаеш пра сябе, што вось дарма ўшчаміўся недзе паміж прозай і паэзіяй...»? ______________________

**В5.** Гэта газета дала найменне цэламу перыяду ў развіцці беларускай літаратуры XX стагоддзя: ______________________.

**В6.** «Паэт выкарыстоўваў шэраг слоў, што пазней пашырыліся ў літаратурным ужытку: *агораць, апантаны, ашчаперыць, водар, дойлід, збочыць, знічка, імклівасць, наканаваны, нелюдзь, непрыдатны, талака, удубальт* і інш. Яму належыць вялікая роля ў замацаванні гэтых слоў у якасці нормы літаратурнай мовы. Яркія, запамінальныя словы-вобразы *шумлівазвонны, ліставея, небазор, арлінавокі, арфазвонны, нябеснакрылы, смуткаглязды, яснавейнасць* і іншыя захавалі водар свежасці». Каго характарызуюць гэтыя словы? ______________________.

**В7.** Спалучэнне «высокіх» і «нізкіх» жанравых формаў, сумяшчэнне філасафічнасці з займальнасцю, прынцып літаратурнай гульні, цытацыя — характэрныя рысы ______________________.

**В8.** Гэта падзея выклікала ўзнікненне такіх твораў, як «Злая зорка» І. Шамякіна, «Львы» І. Пташнікава, «Бабчын» М. Мятліцкага: ______________________.

**В9.** Версэт, пункцір, зном, вершаказ — жанры-наватворы (чые?)______________________.

**В10.** Гэты чалавек зрабіў для ўкраінскай літаратуры тое ж, што для беларускай зрабілі Б. Тарашкевіч, П. Бітэль, Я. Семяжон:______________________.

### Адказы

| | | |
|---|---|---|
| А1. Так | Б1. «Тутэйшыя» | В1. Уладзіміра Караткевіча |
| А2. Так | Б2. Аркадзь Куляшоў | В2. Максіму Багдановічу |
| А3. Не | Б3. «Думы» | В3. «Жураўліны крык», «Сотнікаў», «Знак бяды», «Сцяна» |
| А4. Не | Б4. М. Гарэцкі. «На імперыялістычнай вайне» | В4. Янка Брыль |
| А5. Так | Б5. «Палескую хроніку» І. Мележа | В5. «Наша ніва» |
| А6. Так | Б6. Вёска Стары Улас | В6. Уладзіміра Дубоўку |
| А7. Так | Б7. «Каласы пад сярпом тваім» | В7. Постмадэрнізму |
| А8. Не | Б8. «Завеі, снежань» | В8. Чарнобыльская катастрофа |
| А9. Так | Б9. Чорны — Сент-Экзюперы | В9. Алеся Разанава |
| А10. Так | Б10. Максіма Багдановіча | В10. Максім Рыльскі (пераклаў «Пана Тадэвуша») |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Правільны адказ на кожнае пытанне часткі А ацэньваецца двума баламі, часткі Б — трыма, часткі В — пяццю баламі. Такім чынам, максімальная сума балаў за выкананне тэста — 100.

| Колькасць балаў | Адзнака |
|---|---|
| 100—91 | 10 |
| 90—81 | 9 |
| 80—71 | 8 |
| 70—61 | 7 |
| 60—51 | 6 |
| 50—41 | 5 |
| 40—31 | 4 |
| 30—21 | 3 |
| 20—11 | 2 |
| 10—1 | 1 |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова